УДК 94 (476) “1914/1917”

*А.А. Зябко*

# ДЭЗЕРЦІРСТВА ЯК ФОРМА АНТЫВАЕННАГА ПРАТЭСТУ ВАЙСКОЎЦАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1914–1917 гг.

У артыкуле даследуюцца прычыны ўзнікнення, накірункі, тэндэнцыі развіцця антываеннага дэзерцірства вайскоўцаў расійскай імператарскай арміі на тэрыторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. На аснове аналізу архіўных дакументаў аўтарам выяўляецца тэндэнцыя да ўзрастання колькасці вайскоўцаў-дэзерціраў к пачатку Лютаўскай рэвалюцыі. Гэта ў сваю чаргу паказвае важнасць уплыву азначанай з’явы на развіццё рэвалюцыйных падзей у Расіі ў 1917 г. Акрамя таго, у артыкуле вызначаюцца асноўныя накірункі антываеннага дэзерцірства, а таксама прычыны яго ўзнікнення, якія былі звязаны са стомленасцю ад зацягнутай вайны, слабай матывацыяй да ўдзелу ў баявых дзеяннях ратнікаў апалчэння II разраду і жаданнем ніжніх чыноў хутчэй вярнуцца да сям’і, якая знаходзілася ў цяжкім матэрыяльным становішчы.

## Уводзіны

Першая сусветная вайна стала пераломнай з’явай у гісторыі чалавецтва, якая змяніла не толькі геаграфічныя межы еўрапейскіх краін, але і карэнным чынам паўплывала на лёс вялікіх і малых народаў Старога Свету. З’яўляючыся адной з ключавых прычын рэвалюцыйных падзей 1917–1918 гг., якія прывялі да крушэння буйнейшых імперый і ўтварэння на іх землях нацыянальных дзяржаў, вайна беспаваротна змяніла сацыяльна-эканамічнае, палітычнае, культурнае аблічча не толькі Еўропы, але і ўсяго свету. У гісторыі беларускага народа ваенны канфлікт 1914–1918 гг. займае знакавае месца. Нягледзячы на тое, што вайна, разгортваючыся на тэрыторыі Беларусі, выклікала велізарныя страты і разбурэнні, яна стала каталізатарам для фактараў, якія прывялі ў далейшым да стварэння дзяржаўнасці.

Азначаныя акалічнасці дазваляюць гаварыць аб важнасці і неабходнасці навуковай распрацоўкі праблем гісторыі беларускага народа ў гады Першай сусветнай вайны. Аднак доўгі час беларуская савецкая гістарычная навука не надавала належнай увагі даследаванню акрэсленай праблематыкі. Зводзячы вывучэнне вайны 1914–1918 гг. да разгляду працэсу вядзення бальшавіцкай партыяй народных мас да сацыялістычнай рэвалюцыі, савецкая гістарыяграфія выпускала з-пад увагі многія важныя пытанні грамадска-палітычнага жыцця ў той перыяд. Адным з іх з’яўляецца праблема антываенных выступленняў у асяроддзі вайскоўцаў, у прыватнасці такой формы пратэсту, як дэзерцірства. У манаграфіях савецкага часу гэты аспект асобна не даследаваўся, а разглядаўся ў якасці прыкладу, які павінен быў пацвярджаць агульны вывад аб наяўнасці рэвалюцыйных настрояў у салдацкіх масах пад уплывам дзейнасці бальшавікоў. У той жа час антываеннае дэзерцірства неабходна разглядаць менавіта ў кантэксце неарганізаванага антываеннага руху, які ў комплексе з іншымі фактарамі прывёў Расію да буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Акрамя таго, азначаная з’ява ў сваім развіцці мела пэўныя тэндэнцыі, якія дазваляюць глыбей усвядоміць прычыны падзей 1917 г. Гэтыя акалічнасці даюць магчымасць сцвярджаць аб актуальнасці праблемы, заяўленай у артыкуле, а таксама аб неабходнасці яе дэтальнага вывучэння.

---

Навуковы кіраўнік – А.А. Каваленя, доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі

Мэта артыкула – выяўленне прычын узнікнення, накірункаў і тэндэнцый развіцця антываеннага дэзерцірства вайскоўцаў армій расійскага Заходняга фронта і 5-й арміі Паўночнага фронта.

Для дасягнення мэты неабходна рэалізаваць наступныя задачы:

1) вызначыць накірункі, а таксама колькасныя і якасныя характарыстыкі антываеннага дэзерцірства;

2) на аснове аналіза колькасных дадзеных выявіць і ахарактарызаваць тэндэнцыі развіцця дэзерцірства ў асяроддзі вайскоўцаў Заходняга фронта і 5-й арміі Паўночнага фронта расійскай арміі.

**Дэзерцірства як форма антываеннага пратэсту**

Дэзерцірства (лац. deserio – пакіданне без дапамогі, уцяканне) вызначаецца ў крымінальным праве як парушэнне супраць вызначанага парадку праходжання ваеннай службы, якое выражаецца ў самавольным пакіданні вайскоўцам часці або месца службы з мэтай наогул ухіліцца ад ваеннай службы або ў няяўцы з той жа мэтай на службу пры прызначэнні, пераводзе, з камандзіроўкі, водпуску або лячэбнай установы [1, с. 331]. Гэтая з’ява ў той ці іншай ступені характэрна для ўсіх армій, асабліва ва ўмовах вядзення вайны. Пры гэтым яна можа набываць розны характар, што абумоўлена спектрам прычын яе ўзнікнення.

Нашы даследаванні паказваюць, што ў гады Першай сусветнай вайны дэзерцірства ў значнай ступені набывала менавіта антываенную афарбоўку. Аб гэтым сведчаць архіўныя дакументы, крыніцы мемуарнага і эпісталярнага характару, якія маюць дачыненне да салдат і афіцэраў армій, што размяшчаліся на тэрыторыі Беларусі. У шэрагу данясенняў вайсковай і цывільнай адміністрацыі адзначаюцца факты, калі вайскоўцы-дэзерціры, якія самавольна пакінулі свае палкі, накіроўваліся менавіта на радзіму да сям’і [2, с. 877, 878]. У шэрагу ўспамінаў непасрэдных удзельнікаў вайны і ў салдацкіх пісьмах на радзіму прама ўказваецца на тое, што многія ніжнія чыны пакідалі свае палкі менавіта па той прычыне, што не жадалі больш знаходзіцца на вайне [3, с. 148; 4, с. 34; 5, с. 83, 89]. Азначаная акалічнасць сведчыць аб наяўнасці антываеннага матыву ў дзеяннях многіх з тых, хто дэзерціраваў з імператарскай арміі. Пры гэтым неабходна мець на ўвазе і тое, што некаторая частка дэзерціраў кіравалася крымінальнымі матывамі, аднак змяненне колькасці ўцекачоў у бок павелічэння ў канцы 1916 – пачатку 1917 гг. дае падставы сцвярджаць, што ў значнай колькасці выпадкаў мы маем справу менавіта з антываенным дэзерцірствам.

Дэзерцірства з расійскай арміі ў гады Першай сусветнай вайны набывала розныя формы. Адным з распаўсюджаных спосабаў былі ўцёкі вайскоўцаў з эшалонаў, якія накіроўваліся на перадавыя пазіцыі. Так, у канцы 1915 г. падчас праходжання праз Мінскую губерню эшалона, які дастаўляў 19 Сібірскі стралковы батальён на фронт, з яго пачалося бегства вайскоўцаў [6, с. 205]. Масавасць азначанай з’явы пацвярджаецца і данясеннямі мясцовай адміністрацыі [7, л. 31; 8, л. 13]. Неабходна дадаць, што пашырэнне такога дэзерцірства адбываецца ў канцы 1915 г., калі пасля маштабнага адступлення расійскай арміі апошняя страціла значную колькасць свайго кадравага складу. Пры гэтым на змену прыйшлі тыя катэгорыі вайскоўцаў, якія ў мірны час не праходзілі тэрміновай службы або не павінны былі прызывацца ў армію.

Сярод вайскоўцаў палкоў, якія знаходзіліся на перадавой лініі, мелі распаўсюджанне таксама ўцёкі падчас бою або пасля яго заканчэння. У шэрагу выпадкаў самавольна пакідалі пазіцыю нават цэлыя палкі. Так, палкоўнік Раманаў у тэлеграме на імя Навагрудскага павятовага спраўніка заклікае прыняць меры да вышуку ўсіх вайскоўцаў Лідскага палка, якія дэзерціравалі з тэатра ваенных дзеянняў [9, л. 353].

Азначаная з'ява ў многім была звязана з дэмаралізацыяй салдат, выкліканай папярэднімі баявымі няўдачамі, або баязлівасцю і пасіўнасцю афіцэраў [10, с. 234].

Данясенні вайсковай і цывільнай адміністрацыі сведчаць аб тым, што значныя маштабы набывалі такія формы дэзерцірства, як наўмыснае адставанне ад эшалонаў, уцёкі з санітарных устаноў, пратэрміноўка знаходжання ў адпачынку. Так, у канцы 1915 г. у загадзе Мінскага губернатара адзначалася, што «ў апошні час у паліцэйскае ўпраўленне пастулае маса патрабаванняў розных воінскіх часцей аб вышуку і затрыманні ніжніх воінскіх чыноў, якія самавольна адлучыліся з фронту, з лазарэтаў і каманд і адсталі ад эшалонаў...» [8, л. 13]. Аналагічная сітуацыя адзначалася і ў 1916 г. на тэрыторыі Мінскай і Дзвінскай ваенных акруг. Напрыклад, у цыркуляры начальніка Мінскіх ваенна-акружных упраўленняў ад 7 жніўня 1916 г. указвалася, што «на малых станцыях, паўстанках і раз'ездах стала бадзяцца шмат ніжніх чыноў, якія прыбываюць туды з таварнымі цягнікамі нібыта па справах службы, а затым ад'язджаюць далей з таварнымі цягнікамі...» [11, л. 11]. Маштабнасць азначанай з'явы пацвярджаюць і колькасныя паказчыкі. Так, на вакзале ў Віцебску за перыяд з 21 верасня па 31 кастрычніка 1915 г. і з 15 лістапада па 15 снежня таго ж года было затрымана 960 ніжніх чыноў, якія ехалі без дакументаў або наўмысна адсталі ад эшалона [12, л. 86–152, 911, 1684, 1986]. Пры гэтым многія вайскоўцы, будучы мясцовымі жыхарамі, імкнуліся пакінуць эшалон і збегчы дадому [8, л. 13; 13, л. 299]. Прычынай такіх дзеянняў была трывога аб стане ўласнай сям'і і гаспадаркі і імкненне дапамагчы родным справіцца з цяжкасцямі ваеннага часу.

Неабходна адзначыць, што вызначэнне колькасці вайскоўцаў, якія дэзерціравалі з расійскай арміі ў 1914–1917 гг. з'яўляецца дастаткова няпростай задачай. У навуковай літаратуры прысутнічаюць лічбы, якія адлюстроўваюць колькасць дэзерціраў з усёй расійскай арміі і з яе Заходняга фронта за перыяд з ліпеня 1914 па люты 1917 гг. па афіцыйных дадзеных Стаўкі вярхоўнага галоўнакамандуючага. Згодна з імі, агульная колькасць дэзерціраў за азначаны перыяд Стаўкай вызначаецца ў 195 130 чалавек, а з армій Заходняга фронта – 13648. Пры гэтым, сюды ўключаюцца і вайскоўцы запасных і тылавых часцей. Калі дадаць да лічбы дэзерціраў з Заходняга фронту колькасць дэзерціраў з 5-й арміі Паўночнага фронта, якая размяшчалася ў Віцебскай губерні, то можна вызначыць прыкладную колькасць дэзерціраў з армій, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі. Азначаная лічба, па дадзеных Стаўкі, складала прыблізна 20 тысяч чалавек [14, с. 26]. Аднак неабходна падкрэсліць тое, што падлік вайскоўцаў, якія самавольна пакінулі свае часці, быў задачай дастаткова складанай і працаёмкай, што было абумоўлена шэрагам акалічнасцей. Ва ўмовах вядзення актыўных баявых дзеянняў, якія суправаджаліся людскімі стратамі, праблематычна вылучыць з усёй масы страт катэгорыю тых, хто дэзерціраваў. Гэтая праблема асабліва ўскладняецца падчас адступлення, калі наяўна магчыма вызначыць толькі страты асабовага складу. Так, ва ўспамінах аднаго з удзельнікаў вайны Д. Оськіна адзначаецца, што падчас раптоўнай атакі аўстрыйцаў на яго разведвальную групу, салдаты, якія яго суправаджалі, разбегліся. Апынуўшыся ў часці, ён палічыў тых, хто не вярнуўся, выбыўшымі падчас адступленя [3, с. 95].

У гэтых умовах дэзерціры маглі быць залічаны ў колькасць загінуўшых, палонных, прапаўшых без вестак. Таму, верагодна, сапраўдная іх колькасць будзе некалькі большай за тую, якую дае Стаўка. Аднак дакладна вызначыць лічбу дэзерціраваўшых з армій, якія знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі, на нашу думку, не прадстаўляецца магчымым. Дадзеныя, па якіх можна было б правесці такія падлікі, адсутнічаюць або не з'яўляюцца дакладнымі. Гэта звязана ў першую чаргу з самой пастаноўкай статыстычнай работы, якая ў Ваенным міністэрстве Расійскай імперыі была ў многім бессістэмнай [15, с. 182].

З іншага боку, агульная лічба, якая паказвае колькасць дэзерціраў, не дае магчымасці назіраць яе дынаміку. Аднак у нашым распараджэнні маюцца дадзеныя, якія дазваляюць прасачыць змяненне колькасці ўцекачоў за перыяд з канца 1915 да пачатку 1917 гг. і вылучыць некаторыя тэндэнцыі азначанага працэсу. Менавіта ў гэты час па тэрыторыі Беларусі стабілізаваўся расійска-германскі фронт, што ў сваю чаргу дазваляе разглядаць працэс дэзерцірства і з тылавых часцей, і з франтавых. Акрамя таго, нашы дадзеныя дазваляюць разам з колькасным аспектам прасачыць і якасныя асаблівасці дэзерцірства.

Аналізуючы лічбы затрыманых грамадзянскай паліцыяй і жандармерыяй вайскоўцаў за перыяд з лістапада 1915 г. па люты 1917 г. на тэрыторыі Мінскай і Дзвінскай ваенных акруг, можна вылучыць тэндэнцыю ўзрастання сярэднямесячнай колькасці дэзерціраў к лютаму 1917 г. Так, у беларускіх паветах Віцебскай губерні (Лепельскі, Віцебскі, Гарадоцкі, Дрысенскі, Полацкі) за лістапад 1915 г. – чэрвень 1916 г. затрымлівалася ў сярэднім 135 чалавек за месяц [16, л. 3–64; 17, л. 2–25; 18, л. 20; 19, л. 16–30, 48–58, 134–148]. У паветах Магілёўскай губерні за студзень–жнівень 1916 г. сярэднямесячная колькасць дасягала 195 чалавек [11, л. 8]. З іншага боку, напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі (снежань 1916 г. – люты 1917 г.) сярэднямесячная колькасць затрыманых павялічылася і склала 244 чалавекі для Магілёўскай губерні і 264 – для пяці беларускіх паветаў Віцебскай губерні [11, л. 19–55; 20, л. 7–33; 21, л. 4–29].

Пры аналізе колькасных паказчыкаў дэзерцірства важна ўлічваць такі фактар, як сезонныя хістанні ліку ўцекачоў. Нашы назіранні паказваюць, што ў зімовы перыяд колькасць дэзерціраў некалькі ўзрастае ў параўнанні з вясенне-летнім, што звязана з больш цяжкімі ўмовамі існавання для вайскоўцаў. Аб гэтым сведчаць таксама і пісьмы тых, хто самавольна пакінуў свае палкі. У іх, разам з указаннем на масавасць уцёкаў, ніжнія чыны называюць сярод прычын свайго дэзерцірства і цяжкія ўмовы існавання [20, л. 44–45]. Аднак пры параўнанні прыведзеных вышэй дадзеных па колькасці затрыманых за зімовы перыяд 1915–1916 гг. і 1916–1917 гг. відавочна, што напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі лік дэзерціраў большы, чым за год да яе. Гэта дае магчымасць сказаць, што фактар сезоннасці не аказваў уплыву на назіраемую тэндэнцыю да росту колькасці ўцекачоў напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі.

Такім чынам, тэндэнцыя да павелічэння к лютаму 1917 г. колькасці вайскоўцаў-дэзерціраў сведчыць аб нарастанні антываенных настрояў сярод салдат і афіцэраў расійскай арміі. Ва ўмовах стомленасці ад зацяжной вайны і адсутнасці доўгачаканага міру яны імкнуліся любым спосабам пазбегнуць удзелу ў ваенных дзеяннях, што знайшло праяўленне ў павелічэнні маштабаў іх уцёкаў з арміі.

Акрамя таго, сярод прычын дэзерцірства неабходна ўказаць і сацыяльную несправядлівасць, якую адчувалі салдаты, выхадцы з простага народа. Апошнія былі не задаволены тым, што ў той час, калі яны падвяргалі сваё жыццё небяспецы, знаходзячыся на перадавой, чыноўнікі, паліцыя, гандляры, уладальнікі прадпрыемстваў адседжваліся ў тыле.

Даследуючы антываеннае дэзерцірства, неабходна звярнуць увагу і на якасны склад вайскоўцаў, якія самавольна пакідалі свае часці. Аналіз спісаў вышуку беглых ваенных чыноў Заходняга фронта па Мінскай ваеннай акрузе за перыяд са снежня 1916 г. па люты 1917 г. дазваляе вызначыць для дэзерціраў суадносіны паміж вайскоўцамі страявых часцей і запасных. Ён паказвае, што сярод уцекачоў пераважалі ніжнія чыны запасных палкоў і тылавых інтэнданцкіх устаноў. Так, з 442 асоб, якія пералічаны ў азначаных спісах, 372 чалавекі дэзерціравалі з запасных палкоў [22, л. 67–72, 107, 169–171, 215–226].

На нашу думку, такая сітуацыя звязана з тым, што ўжо ў 1915 г. Расія сутыкнулася з праблемай папаўнення арміі асабовым складам. Значныя людскія страты

за кампаніі 1914–1915 гг. не толькі выбілі са строю значную колькасць кадравых вайскоўцаў, але і падрыхтаваны ў мірны час рэзерв [23, с. 227]. Пры гэтым толькі для ўзнаўлення страт у войсках патрэбна было штомесячна накіроўваць 300–400 тысяч чалавек [15, с. 88]. Менавіта гэтым было абумоўлена рашэнне аб наборы ў дзеючую армію ратнікаў апалчэння II разраду. Пры недахопе падрыхтаваных кадраў пачынаюць павялічваца ў памерах запасныя батальёны, у якіх ажыццяўлялася навучанне гэтай катэгорыі вайскоўцаў. Пасля кароткатэрміновых заняткаў яны траплялі ў маршавыя роты, якія ўдзельнічалі ў крывавых баях лета – восені 1915 г. У выніку былыя ратнікі апалчэння II разраду, маючы ўжо першапачаткова слабую матывацыю да ўдзелу ў вайне, наогул страчвалі баявы дух. Па меры зацягвання вайны для іх станавілася відавочнай пагроза загінуць у складзе франтавых часцей, таму яны імкнуліся ўцячы з запасных палкоў, каб не трапіць у акопы.

**Заключэнне**

Такім чынам, у гады Першай сусветнай вайны дэзерцірства вайскоўцаў з расійскай арміі набывала масавы антываенны характар. Яно праяўлялася ў выглядзе ўцёкаў з транспарту, які накіроўваўся на перадавую, і лячэбных устаноў, самавольнага пакідання баявых пазіцый, наўмыснага адставання ад эшалонаў, пратэрміноўку знаходжання ў водпуску. Нягледзячы на тое, што вызначыць дакладную колькасць вайскоўцаў, якія самавольна пакінулі часці, дастаткова праблематычна, нашы дадзеныя па Мінскай і Дзвінскай ваенных акругах за перыяд канца 1915 – пачатку 1917 гг. дазваляюць выявіць тэндэнцыю да ўзрастання колькасці дэзерціраў напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі. Прычыны гэтага заключаліся як у агульнай стомленасці ад вайны і жаданні міру, так і ў імкненні ніжніх чыноў хутчэй трапіць дадому, дзе ва ўмовах цяжкага эканамічнага становішча ў краіне існавала пагроза разарэння гаспадаркі і гібелі сялянскай сям'і. У гэтых умовах антываеннае дэзерцірства стала адным з важнейшых фактараў развалу арміі і скочвання Расіі да рэвалюцый 1917 г. Акрамя таго, перавага сярод дэзерціраў вайскоўцаў запасных і тылавых часцей была абумоўлена дамінаваннем у 1916–1917 гг. у расійскай арміі ратнікаў апалчэння II разраду, якія мелі слабую ваенную падрыхтоўку і нізкую матывацыю да ўдзелу ў вайне.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Новикова, Е.В. Дезертирство / Е.В. Новикова // Белорусская юридическая энциклопедия : в 4 т. – Минск : ГИУСТ БГУ, 2007. – Т. 1 / редкол.: С.А. Балашенко [и др.]. – 600 с.

2. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900–1917 гг.) / Акад. наук БССР, Ин-т истории ; под ред. В. Н. Перцева [и др.] – Минск : Изд-во АН БССР, 1953. – Т. 3. – 1020 с.

3. Оськин, Д.П. Записки солдата / Д.П. Оськин. – М. : Федерация, 1929. – 160 с.

4. Пирейко, А. В тылу и на фронте империалистической войны / А. Пирейко. – Л. : Прибой, 1926. – 62 с.

5. Царская армия в период мировой войны и Февральской революции / сост. А. Максимов, Е. Медведев, Ш. Юсупов; под ред. А. Максимова. – Казань: Татиздат : Татполиграф, 1932. – 239 с.

6. Савицкий, Э.М. Рабочее движение в Белоруссии (июнь 1907 – февраль 1917 г.) / Э.М. Савицкий. – Минск : БелНИЦДААД, 1995. – 296 с.

7. Дело о предании суду нижних чинов за разные преступления (март 1915 – май 1916). – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Фонд 2687. – Воп. 1. – Спр. 268.

8. Дело о привлечении к ответственности чинов Игуменской уездной полиции за непринятие мер к обнаружению и задержанию нижних воинских чинов, самовольно ушедших с фронта (ноябрь 1915 – июнь 1916) // НГАБ. – Фонд. 299. – Воп. 1. – Спр. 16354.
9. Циркуляры Минского губернатора начальникам полиции о проведении мероприятий в связи с введением в действие положения о подготовительном периоде к войне, о предупредительных мерах к предотвращению забастовок (август–декабрь 1914 г.) // НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 8591б.
10. Лемке, М.К. 250 дней в царской ставке, 1914–1915 / М.К. Лемке. – Минск : Харвест, 2003. – 446 с.
11. Дело о доставлении сведений о задержании вне городов беглых воинских нижних чинов (сентябрь 1916 – март 1917) // НГАБ. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 2107.
12. О проступках нижних чинов гарнизона (август–ноябрь 1915) // НГАБ. – Фонд 2533. – Воп. 1. – Спр. 131.
13. Переписка о самовольно отлучившихся и дезертировавших нижних чинах (август-декабрь 1915) – НГАБ. – Фонд 2533. – Воп. 1. – Спр. 11.
14. Россия в мировой войне 1914–1918 года (в цифрах) / ЦСУ, Отдел воен. статистики. – М. : 1925. – 104 с.
15. Головин, Н.Н. Военные усилия России в мировой войне / Н.Н. Головин. – М. : Жуковский : Кучково поле, 2001. – 434 с.
16. Дело о дезертировавших нижних чинах из воинских частей (январь–декабрь 1916) // НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 49109.
17. Дело о принятии мер к прекращению вредной деятельности евреев в Полоцком уезде, распространявших слухи об эвакуации и скупающих по дешевой цене скот от населения (дек. 1915 – янв. 1916) // НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. Спр. – 49285.
18. Дело по доставлению сведений о настроении населения в связи с военными действиями (ноябрь 1915 – 1916) // НГАБ. – Фонд. 1430. – Воп. 1. – Спр. 49134.
19. Ведомости о деятельности урядников в разных уездах (февраль–ноябрь 1916) – // НГАБ. – Фонд 1416. – Воп. 2. – Спр. 25729.
20. Дело о розыске лиц, уклоняющихся от воинской повинности (январь–февраль 1917) // НГАБ. – Фонд 1416. – Воп. 1д. – Спр. 2774.
21. Дело о розыске лиц, уклоняющихся от воинской повинности (февраль–март 1917) // НГАБ. – Фонд 1416. – Воп. 1д. – Спр. 2775.
22. Приказы по Минскому военному округу (январь–март 1917) // НГАБ. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 2114.
23. Керсновский, А.А. История русской армии, 1881–1916 / А.А. Керсновский. – Смоленск : Русич, 2004. – 510 с.

***Zyabko A.A.*** **Desertion as a Form of the Soldiers' Anti-War Protest on the Territory of Belarus in 1914–1917**

Basing on analysis of scientific literature and archival documents this article investigates the causes of origin, main directions and trends of development of anti-war desertion in the imperial army at Russian Western front of the World War I. After studying quantitative and qualitative aspects of this phenomenon, the author determines the degree of influence of this anti-war protest form on the revolutionary events of 1917.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 05.08.2011